ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

24 лістапада 1931 г.
№ 26 (1540)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Рэалізуем баявую праграму

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б разгледзеў важнейшыя вузлавыя пытаньні нашага соцыялістычнага будаўніцтва: аб чыгуначным транспорце, разьвіцьці соцыялістычнай жывёлагадоўлі, організацыйна-гаспадарчым замацаваньні колгасаў, загатоўках, а таксама інформацыі аб перавыбарах парторганаў.

Чыгуначны транспорт БССР, пры наяўнасьці некаторага палепшаньня, усё яшчэ застаецца вузкім месцам у нашай народнай гаспадарцы, не забясьпечвае выкананьня пляну перавозак.

Комсамольскія організацыі на транспорце яшчэ не перабудавалі сваю работу адпаведна з задачамі транспорту, не перанесьлі цэнтр цяжару ў групу, брыгаду, на паравоз.

Задача комсамольскіх ячэек: давесьці пастановы гэтага пленуму да кожнага комсамольца, маладога рабочага чыгуначніка, разгарнуць вакол іх сапраўды бальшавіцкую работу. Вузлавыя вучасткі гэтай работы на сёнешні дзень—паравозны парк, служба эксплёатацыі і вагонны парк. Палепшыць гэтыя вучасткі—значыць ліквідаваць зрывы спаранай язды, зьнішчыць абязьлічку ў паравозным і вагонным парку, даць поўную нагрузку паравозу, зваяйшчуўшы карысна-продукцыйную работу яго на адну гадзіну ў суткі, мобілізаваць усе рэзэрвы для пашырэньня вагоннага парку, дабіцца лепшай якасьці рамонту паравозаў і вагонаў. Транспартная комсамолія даб'ецца гэтай перамогі толькі на аснове ажыцьцяўленьня 6 умоў т. Сталіна і загаду Андрэева.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК дабілася значных посьпехаў у справе ўздыму сельскай гаспадаркі. КП(б)Б, наўхільна ажыцьцяўляючы генеральную лінію партыі, з посьпехам ператварае БССР з раёну спажываючага ў раён буйна разьвітай соцыялістычнай жывёлагадоўлі і тэхкультур. Соцыялістычны сэктар ужо ў бягучым годзе здаў дзяржаве 21 тысячу 300 цэнтнэраў сьвіного мяса 670 тысяч цэнтнэраў малака.

Задачай комсамолу зьяўляецца дапамога КП(б)Б форсаваць пад яе кіраўніцтвам рэалізацыю програмы па разьвіцьцю жывёлагадоўлі ў БССР. КСМ ячэйкі павінны зараз мобілізаваць усе сілы на выкананьне пляну ўкомплектаваньня МТФ і СТФ, організаваць умелую гадоўлю маладняка, змагаючыся з вялікім адыходам, стратамі ў жывёлагадоўлі. Важнейшай задачай зьяўляецца пашырэньне кармовае базы, скончэньне будаўніцтва сьвінарнікаў і абор, барацьба за высокую таварнасьць і якасьць. Гэтага можна дасягнуць увядзеньнем зьдзельшчыны і ліквідацыяй абязьлічкі ў жывёлагадоўчых гаспадарках.

Організацыя працы ў колгасах на аснове ўвядзеньня зьдзельшчыны, правільнага разьмеркаваньня даходаў па прынцыпу колькасьці і якасьці затрачанай працы, падрыхтоўка кадроў, павышэньне ўраджайнасьці—цэнтральныя задачы дня.

Комсамольскія організацыі яшчэ не пераключыліся на баявое выкананьне асноўнай задачы колгаснага будаўніцтва—організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў.

Поўнае выкананьне пляну загатовак да бягучага году зьяўляецца важнейшай зброяй організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў. Комсамольская організацыя, разгортваючы масава-палітычную работу сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў беднякоў і серадняков, павінна дабіцца выкананьня пляну загатовак.

Пленум у сваіх пастановах даў глыбокі і ўсебаковы аналіз нашага сучаснага будаўніцтва і высунуў першачарговыя задачы. Усе сілы, уся ўвага комсамольскай організацыі павінны быць адданы на выкананьне іх.

5-га сьнежня—усебеларускі зьлёт ударнікаў фінфронту

З мэтай замацаваньня актывістых і далейшага разгортваньня актыўнай работы ў галіне выкананьня да 10 сьнежня фінансавага пляну 3-га рашаючага году і падрыхтоўкі да сустрэчы апошняга году пяцігодкі, Наркомфін, пры актыўным удзеле профсаюзаў фінбанкаўскіх працаўнікоў, склікае 5-га сьнежня ўсебеларускі зьлёт ударнікаў фінансавага фронту.

Задача комсамольскіх організацый усіх раёнаў у тым, каб выявіць зараз лепшых ударнікаў-комсамольцаў для пасылкі іх на зьлёт, дабіцца поўнага выкананьня фінпляну, што будзе лепшым падарункам зьлёту.

Зараз-жа, на агульных сходах комсамольскіх ячэек, скарыстоўваючы нізавы і раённы друк, трэба папулярызаваць значэньне ўсебеларускага зьлёту ўдарнікаў фінансавага фронту і выявіць лепшых комсамольцаў, якія змагаюцца за выкананьне фінпляну.

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ атрымала на зьлёт адно месца, якое будзе прадстаўлена лепшаму юнкору, змагару за мобілізацыю сродкаў.

Дэлегацыя комсамольцаў Саксоніі ў Беларусі

Дэлегаты гутараць з тав. Гэрманам Пэтшэм—нямецкім рабочым, які на працягу году працуе на заводзе імя Варашылава.

Аб ходзе загатовак

Пастанова аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

1. Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК констатуе, што загатоўкі асноўных відаў сельска-гаспадарчай продукцыі ва ўстаноўленыя тэрміны ня выкананы, што тармозіць пасьпяховую барацьбу за выкананьне плянаў соцыялістычнага будаўніцтва. Гадовы плян загатовак збожжа выканан на 10-XI 1931 году на 40,2 проц. (з памольным зборам), бульбы—на 43,9 проц. ільнянага семя—на 38,9 % лёну—4,7 проц., жывёлазагатовак—на 32,5 проц., квартальнага пляну.

Адставаньне ў загатоўках тлумачыцца і тым, што цэлы рад парторганізацый, савецкіх загатоўчых органаў, саўгасная і колгасная сыстэмы не організавалі па-бальшавіцку справы загатовак, прадаставілі яе самацёку, не далі руйнуючага адпору гутаркам аб нерэальнасьці загатоўчых плянаў, ня выкарысталі ў поўнай меры больш спрыяючых умоў, у якіх праходзіць загатоўчая кампанія гэтага году (вопыт клясавай барацьбы за загатоўкі, узмацненьне і рост аўторытэту партыі і савецкай улады, рост вясковых парторганізацый і інш.). Загатоўчай кампаніі гэтага году спрыяюць тыя абставіны, што соцыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі зьяўляецца пераважным, і асноўная маса сельска-гаспадарчай продукцыі знаходзіцца ў саўгасах і колгасах.

2. Некаторыя парторганізацыі і загатоўчыя органы замест руйнуючага ўдару па кулаку і яго агентуры ў партыі—правых і „левых“ опортуністых,—замест рашучай барацьбы са стаўкай кулака на зрыў загатовак, замест выкрыцьця яго новай тактыкі ў барацьбе супроць дыктатуры пролетарыяту (імкненьне ўвайсьці ў колгасы і разбурыць іх з сярэдзіны, распальваньне спажывецкіх і рвацкіх тэндэнцый сярод адсталых груп колгасьнікаў, выкарыстоўваньне гэтых колгасьнікаў у якасьці сваёй агентуры і г. д.), дапусьцілі процістаўленьне з боку асобных работнікаў і колгасаў мясцовых інтарэсаў інтарэсам пролетарскай дзяржавы, што адбівае антыпартыйную кулацкую ідыолёгію і практыку.

Вынікам праваопортуністычнай практыкі ў радзе раёнаў зьявілася зусім нездавальняючае, ня ў тэрмін спаганяньне продукцыі ў парадку цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам і недаабкладаньне кулака пры наяўнасьці фактаў перагібаў у адносінах да серадняка (дача цьвёрдых заданьняў).

3. Разгорнутая масава-палітычная работа, без праводзеньня якой ня можа з посьпехам весьціся барацьба за загатоўкі, у некаторых раёнах ігнаравалася і была падменена шырокай практыкай адміністраваньня. У гэтых раёнах не вялося шырокай растлумачальнай работы ў колгасах аб першачарговым выкананьні сваіх абавязкаў перад дзяржавай, не даваўся рашучы адпор антыпролетарскім імкненьнем процістаўіць свае мясцовыя патрэбы інтарэсам дзяржавы (што выявілася ў зьмяншэньні валавой продукцыі, непамерным павялічэньні кармовых фондаў, у разважаньнях аб нерэальнасьці плянаў, рвацкіх настроях, у затрыманьні здачы (продажу) дзяржаве сельска-гаспадарчай продукцыі і г. д.). У радзе раёнаў існуе яўная недаацэнка ролі індывідуальнага сэктару ў загатоўках, у выніку—індывідуальны сэктар слаба організаваны на выкананьне плянаў загатовак, а таксама яўна нездавальняюча праводзіцца работа па выкананьню аднаасобнікам контракцыйных умоў.

Пленум лічыць, што асобныя работнікі страцілі клясавую пільнасьць, не зразумелі таго, што ў колгасах толькі пачынаецца перавыхаваньне селяніна на данай стадыі колгаснага руху ў яго арцельнай форме, а не завяршаецца, ня ўлічылі наяўнасьці элемэнтаў клясавай барацьбы ў колгасах і не мобілізавалі мас колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства для бязьлітаснага адпору кулацкім і рвацкім элемэнтам.

Выходзячы з гэтага, аб'яднаны пленум пастанаўляе:

1. Цалкам і поўнасьцю ўхваліць пастанову бюро ЦК КП(б)Б ад 23-X 1931 г. аб загатоўках, якая (пастанова) з бальшавіцкай няпрымірымасьцю ўдарыла па тых партыйных і савецкіх кіраўнікох, якія, адбіваючы дробна-буржуазныя сялянскія настроі, дайшлі да правоопортуністычнага процістаўленьня спажывецкіх настрояў раду колгасаў інтарэсам пролетарскай дзяржавы, якія ня здолелі організаваць масы на няўхільную барацьбу супроць буржуазных тэндэнцый у некаторых зьвеньнях дзяржаўных апаратаў (Белсельтрэст) і тым самым ня здолелі забясьпечыць поўнасьцю і ў тэрмін выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб загатоўках. У прыватнасьці, пленум цалкам ухваляе пастанову бюро ЦК аб зьняцьці з працы правоопортуністычнага кіраўніцтва Белсельтрэсту, раду сэкратароў райкомаў КП(б)Б, старшынь РВК і райколгассаюзаў.

Пленум лічыць, што кіраўніцтва Колгасцэнтру дапусьціла правядзеньне няправільнай лініі, якая не забясьпечвала выкананьня бальшавіцкімі тэмпамі загатовак па колгаснай сыстэме.

2. Цяпер у разгар загатоўчай кампаніі неабходна ўсямерна ўзмацніць рашучую барацьбу за сваечасовае і поўнае выкананьне плянаў загатовак, мобілізуючы для гэтай мэты ўсе сілы. Перад усімі партыйнымі, загатоўчымі, колгаснымі, саўгаснымі і іншымі грамадзкімі організацыямі стаіць задача баявога павышэньня тэмпаў загатовак асабліва ў галіне барацьбы за збожжа, бульбу, мяса, лён, каноплі і экспортную продукцыю.

Пленум ставіць як абавязак перад усімі організацыямі—неабходнасьць разгортваньня самай рашучай і пасьлядоўнай барацьбы са спажывецкімі, рвацкімі тэндэнцыямі ў колгасах, з буржуазнымі скажэньнямі лініі партыі ў некаторых зьвеньнях дзяржаўных апаратаў, патрабуе, каб кожны член партыі вёў шырокую растлумачальную масавую работу сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў аб іх абавязках у здачы (продажу) пролетарскай дзяржаве сельска-гаспадарчай продукцыі. Рабочая кляса, ажыцьцяўляючы кіраўніцтва соцыялістычнай перабудовай вёскі, аказваючы вялізарную тэхнічную, фінансавую і інш. матар'яльную і організацыйную дапамогу сялянству і асабліва колгасам, мае права патрабаваць выкананьня колгасамі іх абавязкаў перад пролетарскай дзяржавай.

3. Пленум патрабуе, каб у бліжэйшыя дні быў створан карэнны пералом у ходзе загатовак шляхам абавязковай здачы саўгасамі вызначанай плянам загатовак продукцыі не пазьней 10 сьнежня, шляхам рашучага ўзмацненьня работы на здачы (продажу) продукцыі колгасамі і сыстэматычнай барацьбы супроць недаацэнкі індывідуальнага сэктару ў загатоўках, праводзячы гэту работу з такім разьлікам, каб ва ўстаноўленыя тэрміны былі скончаны загатоўкі. Неабходна работу па ўзмацненьню тэмпаў загатовак правесьці такім чынам, каб саўгасы, колгасы і МТС зьяўляліся прыкладам для аднаасобнікаў сваёй датэрміновай здачай продукцыі дзяржаве і былі сапраўднымі організатарамі ўсіх, памятаючы, што барацьба супроць спажывецкіх настрояў у колгасах, за сваячасовае і поўнае выкананьне імі сваіх абавязкаў перад дзяржавай ёсьць барацьба за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгаснага будаўніцтва.

4. Пленум даручае Наркомснабу і ўсім райпарторганізацыям неадкладна прыняць заходы да поўнага выкананьня плянаў загатовак і асабліва:

а) Па збожжу—разгарнуць рашучую барацьбу з ігнараваньнем таварнасьці збожжавых культур БССР, організаваць грамадзкі контроль супроць разбазарваньня збожжа ў саўгасах і колгасах, вядучы бязьлітаснае змаганьне супроць зьмяншэньня валавога збору, за поўнае выяўленьне лішкаў збожжавых культур і першачарговую здачу дзяржаве па ўсіх абавязацельствах, у прыватнасьці па контрактацыі, прыняўшы тэрміновыя заходы да вывазкі і забясьпечаньня хаваньня збожжавых культур, якія знаходзяцца ў глыбінных пунктах.

Пленум даручае ЦКК-РСІ і Наркомснабу ўзмацніць барацьбу супроць разбазарваньня памольнага збору, прыняўшы рашучыя меры аж да прыцягненьня да партыйнай і судовай адказнасьці асоб, вінаватых у гэтым;

б) Па бульбе—у бліжэйшыя дні цалкам скончыць адгрузку бульбы для пролетарскіх цэнтраў Саюзу і пераключыцца па-баявому на выкананьне плянаў загатовак для патрэб гарадоў БССР і прамысловасьці, раўняючыся ў гэтай рабоце па перадавых раёнах, якія здолелі правесьці бальшавіцкімі тэмпамі адгрузку бульбы пролетарскім цэнтрам СССР (Полацк, Пухавічы, Плешчаніцы, Касьцюкевічы, Клімавічы, Мсьціслаў, Сянно, Талачын, Бабруйск).

в) Па ільна-каноплях—організаваць першапачатковую апрацоўку ільна згодна даных плянаў у колгасах і сярод аднаасобнікаў, прывесьці ў поўную гатоўнасьць загатоўчы апарат, праверыць выкананьне пляну завозу прамтавараў, праінструктаваць сельупаўнаважаных па загатоўках, дабіўшыся актыўнай работы загатоўчых апаратаў ня толькі ў організацыі загатовак, але і ў апрацоўцы ільна і канапель, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якасьць здаванай продукцыі;

г) Па мясу—патрабаваць ад загатоўчых органаў і парторганізацый разгортваньня барацьбы з недапушчальнай тэндэнцыяй выкананьня мясазагатовак выключна за лік буйной рагатай жывёлы пры зусім недастатковай загатоўцы сьвіней, адначасова карэнным чынам павысіўшы тэмпы мясазагатовак. Разам з тым неабходна ўзмацніць барацьбу супроць разбазарваньня жывёлы, асабліва сярод аднаасобнікаў!

д) Па экспартнай продукцыі—правесьці рашучае змаганьне з ігнараваньнем загатовак экспортнай продукцыі, організаваўшы работу такім чынам, каб адначасова з асноўнымі відамі загатовак выконваліся пляны загатовак па экспортнай продукцыі.

Пленум звяртае ўвагу парторганізацый на неабходнасьць дабіцца абавязковага палепшаньня якасьці здаванай продукцыі, разгортваючы ў гэтым напрамку рашучую барацьбу і разглядаючы здачу нядобраякаснай продукцыі, як вынік кулацкага ўплыву. Таксама неабходна безадкладна і самым рашучым чынам палепшыць тэхніку прыёмкі, дабіваючыся ўважлівых адносін да здатчыка.

5. Пленум лічыць, што посьпехі ў выкананьні загатоўчых плянаў залежаць у значнай ступені ад разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва мас (пры адначасовым прэм'іраваньні лепшых здатчыкаў—колгасаў, саўгасаў і аднаасобнікаў), ад рашучай барацьбы супроць вядомай „тэорыі“ чарговасьці кампаній, ад сваячасовага і ў тэрмін выкананьня ўсіх відаў загатовак асабліва з боку загатоўчых органаў. Пленум даручае ЦКК-РСІ праверыць сыстэму кіраўніцтва і ўліку загатовак з боку адпаведных органаў, прыняўшы рашучыя меры ўздзеяньня ў адносінах элемэнтаў, няздольных па-новаму кіраваць справаю загатовак.

6. Пленум абавязвае ўсе парторганізацыі па-бальшавіцку ўзяцца за выкананьне пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) „аб разгортваньні савецкага гандлю і палепшаньні забясьпечаньня рабочых“ і даручае Наркомснабу, Белкоопсаюзу і ўсім райпарторганізацыям выканаць дырэктыву партыі аб разгортваньні загатовак ЗРК, ЦРК, ЗВК і ТПО, аб адкрыцьці крам саўгасамі і колгасамі „пры абавязковай умове першачарговай здачы (продажу) продукцыі дзяржаве па цэнтралізаваных плянах“ і аб распаўсюджваньні савецкіх базараў.

Пленум падкрэсьлівае, што ад сваячасовага і поўнага выкананьня плянаў загатовак і ад максымальнай мобілізацыі ўнутраных харчовых рэсурсаў залежыць далейшае палепшаньне рабочага забясьпечаньня.

7. Пленум лічыць недапушчальным, што ў радзе раёнаў няма належнага зруху ў выкананьні цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі, і патрабуе неадкладнага ўзмацненьня гэтай работы, вядучы рашучую барацьбу з усімі кулацка-заможнымі элемэнтамі, якія ня выконваюць гэтых заданьняў. Адначасова даручыць РК і РВК зараз-жа выправіць перагібы, якія мелі месца ў радзе раёнаў пры правядзеньні практыкі цьвёрдых заданьняў (закрананьне серадняка), а таксама няпоўнае выяўленьне і недаабкладаньне кулака.

8. Пленум даручае парторганізацыям выкарыстаць кампанію перавыбараў парторганаў для ўзмацненьня справы загатовак, актывізаваць у барацьбе за загатоўчы плян комсамол, працоўных жанчын, сельскія саветы і інш. грамадзкія організацыі з такім разьлікам, каб гадовы плян загатовак выканаць поўнасьцю і ў тэрмін.

Пастанова аб рачным транспорце будзе зьмешчана заўтра.
Астатнія пастановы на 2-й і 3-й старонцы.

Астатнія пастановы на 2-й і 3-й старонцы.

Трымаць раўненьне па перадавых

ЛЕПЕЛЬ. Колгасьнікі „Варашылава“ ўключыліся ў месячнік апрацоўкі і здачы ільнавалакна дзяржаве, і па-баявому ўзяліся за працу. Паміж брыгадамі трапальшчыц разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, наладжана бесьперапынная сутачная праца, ільнамялкі нагружаны поўнасьцю. За суткі брыгада на адной мялцы апрацоўвае больш 14 пудоў ільнавалакна. На сёньнешні дзень Варашылаўцы здалі дзяржаве 1,5 тоны валакна.

Іншы малюнак у колгасе „Перамога“. Соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ня ўжываецца, праца ганебна адстае. Колгас, маючы трохвальную мялку, не выкарыстоўвае яе. Перавезеная 6 вельная машына з колгасу імя Варашылава 3 дні прастаяла без працы, а зараз выпрацоўвае замест 2,5 цэнтнэраў—0 4.

Ударнікі колгасу імя Варашылава абураны такой працай колгасу „Перамога“ і патрабуюць прыцягнуць да адказнасьці праўленьне гэтага колгасу за бязьдзейнасьць.

Белта.

1931-32 годы—гады ўдарнага разьвіцьця соцжывёлагадоўлі і сьвінагадоўлі

Пастанова аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б па дакладах т.т. Рачыцкага і Калніна аб разьвіцьці соцыялістычнай жывёлагадоўлі ў БССР*)

1. 1931 і 1932 г. г. павінны быць гадамі такога-ж рашучага пералому ў разьвіцьці соцыялістычнай жывёлагадоўлі, якімі былі 1929 і 1930 г. ў справе арганізацыі соцыялістычнай збожжавай гаспадаркі" (з адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР).

Проблема разьвіцьця соцыялістычнай жывёлагадоўлі і асабліва сьвінагадоўлі зьяўляецца актуальнай для БССР як аднаго з важнейшых жывёлагадоўчых раёнаў Савецкага Саюзу. За апошні год у БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе дасягнуты значныя посьпехі ў справе разьвіцьця соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Па БССР арганізавана 184 жывёлагадоўчыя саўгасы, у тым ліку 85 сьвінаводчых з агульным пагалоўем буйнай рагатай жывёлы 45.129 галоў; з іх 26 тысяч кароў.—74 тысячы сьвіней, з якіх 2830 сьвінаматак. Па саўгасах сьвінавода ор анізавана 1018 малочна-таварных фэрм з агульным пагалоўем 120 тысяч, з якіх 72 тысячы кароў; 1600 сьвінаводчых колгасных таварных фэрм з агульным пагалоўем 120 тысяч, з якіх 71200 сьвінаматак.

Соцсэктарам у 1931 г. здана таварнай продукцыі малака 670660 цэтнэраў, і сьвіной мяса 21 тысяча цэтнэраў што ў параўнаньні з мінулым годам дае значнае павышэньне.

Разгорнута шырокае будаўніцтва кароўнікаў, сьвінарнікаў, птушнікаў, кральчатнікаў. Дасягнуты значныя посьпехі ў галіне кармовай базы для жывёлагадоўлі.

2. Пленум ЦК і ЦКК падкрэсьлівае, што дасягнутыя посьпехі зьяўляюцца толькі пачаткам у справе вырашэньня жывёлагадоўчае проблемы. За ачатак форсаванага разьвіцьця жывёлагадоўлі яшчэ ня стала ў цэнтры штодзённай увагі партыйных, савецкіх, зямельных і колгасна-коопэрацыйных організацый існуе няўменьне па-новаму конкрэтна і опэрацыйна кіраваць і працаваць на гэтым важнейшым і адказьнейшым вучастку работы. Яшчэ не разгорнута сапраўдная бальшавіцкая барацьба а за поўнае і сваячасовае выкананьне плянаў жывёлагадоўлі, адсутнічае сыстэматычная барацьба за палепшаньне якасных паказчыкаў і з стратамі ў жывёлагадоўлі, ня створана сталая кармовая база, мае месца неэкономнае выдаткаваньне і разбазарваньне кармоў. Комплектаваньне колгасных і саўгасных фэрм, будаўніцтва кароўнікаў і сьвінарнікаў праходзіць нездавальняюча. Комплектаваньне птушкаводных і кролікаводных саўгасных і колгасных фэрм зусім не разгорнута.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК пастанаўляе:

Лічачы абавязковым поўнае выкананьне намечаных плянаў 1931 году па разьвіцьці соцыялістычнай жывёлагадоўлі і неабходным мобілізаваць увагу на ліквідацыю прарываў па выкананьню пляну гэтага году, зацьвердзіць аб'ём мерапрыемстваў па разьвіцьцю жывёлагадоўлі, намечаных ЦК і СНК ад 22 жніўня г. г., даручыўшы бюро ЦК іх удаканаліць пры складаньні кантрольных лічбаў на 1932 год.

Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б патрабуе ад усіх парторганізацый, земорганаў, саўгастрэстаў і колгаснай сыстэмы паставіць у цэнтры сваёй практычнай работы задачу формаваньня гурту жывёлагадоўчых саўгасаў, МТФ, СТФ птушкаводных і кролікаводных гаспадарак, як за лік выкананьня плянаў жывёлазагатовак, разгортваньня самазатовак унутры колгасаў і сярод колгасьнікаў. так і асабліва за лік поўнага захаваньня і вырошчваньня ўласнага прыплоду, што павінна зьявіцца асноўнай крыніцай комплектаваньня. Парторганізацыі, НКЗ, саўгастрэсты і колгасныя сыстэмы павінны паставіць у цэнтры сваёй работы па разьвіцьцю жывёлагадоўлі справу вырашчваньня маладняка, праводзячы рашучую барацьбу з убоем маладняка, рагатай жывёлы і падзяжом парасят, з убоем сьвіней пад прыкрыцьцем эпізоотыі, зьвярнуўшы асаблівую увагу на вырошчваньне племяннога маладняка высокаякаснай пароды і комплектаваньне цялічных фэрм.

Азначаючы надзвычайна высокі прац. ялавасьці кароў (10-15 проц.) і сьвіней (25-30 проц.), што тармозіць пашырэньне гурту і прыносіць вялікія страты, пленум абавязвае:

а) Наркомзем, саўгастрэсты, Колгасцэнтр разгарнуць шырокую работу па ліквідацыі ялавасьці. У двухдзкадны тэрмін установіць выразную сетку злучных пунктаў па БССР, да 1-4—32 г. закончыць іх арганізацыю. Правядзеньне злучкі ў маі павінна быць такой-ж важнейшай і ўдарнай кампаніяй, як пасеўная і ўборачная.

б) Правесьці на працягу 1932 году мэтызацыю ўсяго пагалоўя сьвіней у саўгасах, сьвінатрэстах і ня менш 50 проц. сьвінога пагалоўя ў сьвінаводчых таварных колгасных фэрмах і на буйнай рагатай жывёле 50 проц. на ўсіх саўгасах і ня менш 30 проц. у малочна-таварных фэрмах.

в) улічваючы недастатковасьць высокаякасных вытворцаў, арганізаваць не пазьней 1-4—32 году ва ўсіх без выключэньня раёнах пункты штучнага апладненьня і безадкладна разгарнуць масавую работу як па папулярызацыі гэтага мерапрыемства, так і па непасрэднаму правядзеньню злучнай кампаніі. Абавязаць Наркомзем забясьпечыць гэтыя пункты адпаведнымі кадрамі, прэпаратурай і абсталяваньнем.

Пленум абавязвае Наркомзем, дырэктароў саўгастрэстаў і Колгасцэнтр забясьпечыць выкананьне пастановы ЦК і СНК аб народным раёнаваньні па жывёле, правёўшы рашучую барацьбу з недацэнкай гэтай справы і месьніцкімі тэндэнцыямі ў канцэнтрацыі высокаякасных племянных матэр'ялаў. Даручыць СНК у месячны тэрмін намеціць сетку племянных баз і рассаднікаў у БССР у адпаведнасьці з раённым раёнаваньнем.

Прапанаваць Наркомзему і райвыканкомам ... пастановы ЦК і СНК аб разьвіцьці у БССР конегадоўлі, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якаснае яго паляпшэньне шляхам шырокай мэтызацыі праз пункты штучнага апладненьня і пашырэньня колькасьці конезаводаў і племянных пунктаў. Адначасова з гэтым весьці рашучую барацьбу з разбазарваньнем конскага пагалоўя.

Пленум абавязвае Наркомзем, саўгастрэсты, дырэктароў саўгасаў і Белколгасцэнтр правесьці ў 1932 годзе наступныя конкрэтныя мерапрыемствы па барацьбе са стратамі ў жывёлагадоўлі: паглоўную імунізацыю супроць чумы ўсяго сьвінога гурту ў соцыялістычным сэктары і дабіцца бязумоўнага выкананьня ва ўсіх гаспадарках шырокіх профіляктычных мерапрыемстваў, давесьці да мінімуму ялавасьць кароў і сьвіней, дабіцца поўнага захаваньня маладняка, асабліва парасят, шырока прымяняючы прэміяваньне лепшых работнікаў саўгасаў і колгасьнікаў за актыўную барацьбу са стратамі ў жывёлагадоўлі. Даручыць Наркомзему распрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы барацьбы са стратамі ў жывёлагадоўчых саўгасах і колгасах ВЭТ забясьпечыць у намечаны тэрмін скончэньне пабудовы віцебскай біофабрыкі, ашырыўшы выраб біопрапаратаў і патаніўшы іх кошт.

Пленум патрабуе ад земорганаў саўгастрэстаў Колгасцэнтру, райкомаў і ячэек КП(б)Б укомплектаваць аборы, сьвінарнікі саўгасаў. МТФ і СТФ, птушкаводчыя і кролікаводныя гаспадаркі сталымі кадрамі работнікаў вылучаючы іх з колькасьці лепшых, адданых справе рабочых і работніц саўгасаў, колгасьнікаў і колгасьніц. Рашуча ліквідаваць абязьлічку ў рабоце па догляду за жывёлай. З бясьпечыць лепшыя ўмовы работы для сьвінарoў, сьвінарак, даільшчыц, сотнікаў і пастухоў, ад якіх у значнай меры залежыць выкананьне плянаў выхаду і якасьці таварнай продукцыі, перавесьці работу па догляду за жывёлай на зьдзельна-прэміяльную сыстэму.

Даручыць Наркомзему, саўгастрэстам, Колгасцэнтру ў месячны тэрмін распрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы па ўкараненьню гаспадарчага разрахунку ў жывёлагадоўчых саўгасах і колгасах.

Даручыць Саўнаркому распрацаваць у месячны тэрмін сыстэму прэміяваньня жывёлагадоўчых саўгасаў і колгасаў, утварыўшы для гэтае мэты прэміяльны фонд у суме 500 тысяч рублёў.

Пленум з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае неабходнасьць стварэньня магутнай кармовай базы для жывёлагадоўлі і прапануе Наркомзему распрацаваць спэцыяльны плян мерапрыемстваў, накіраваных на павышэньне ўраджайнасьці палявых культур, мерапрыемстваў па організацыі штучных выпасаў і палепшаньню лугавых угодзьдзяў, пашырэньню пасеву кармовых траў і карэньнеплодаў.

Абавязаць Наркомснаб пабудаваць у 1932 годзе буйны мэханізаваны завод па выпрацоўцы комбікармоў ня менш 50 тысяч тон, Наркомзему пабудаваць у саўгасах і колгасах комбікормачныя заводы ў колькасьці 30 з вытворчасьцю да 180 тысяч тон комбікармоў.

Устанавіць жорсткую экономію ў выдаткаваньні кармоў па саўгасах і колгасах шляхам устанаўленьня кармавых рацыёнаў, мобілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў. Гэта мерапрыемства ні ў якім выпадку не павінна праводзіцца за лік здачы (продажу) продукцыі дзяржаве.

Абязаць ЭКОСО распрацаваць конкрэтны плян мерапрыемстваў па мэханізацыі саўгасаў і колгасаў з тым, каб ужо ў 1932 г. мэханізаваць поўную выдачу добраякаснай вады і ня менш чым на 50 проц. падрыхтоўку і падачу кармоў, максымальна выкарыстоўваючы для гэтай мэты сродкі і рэсурсы саміх саўгасаў і колгасаў. Устанавіць конкрэтнае заданьне прамысловасьці па выпрацоўцы машын і абсталяваньня...

*) Друкуецца у скарочаным выглядзе

Пакінуты „Щ 455“

Даць магчымасьць для вытворчай практыкі хутчэй пусьціць паравоз Щ—455

Праз густую сетку рэек праходзім у паравознае дэпо. У цэху—холад; ня топлена. Відаць кіраўніцтва не патурбавалася стварыць належныя ўмовы.

На цяжкіх домкратах узьняты паравоз. Ён сурова пазірае на тых, хто трапіў у дэпо. Здаецца, паравоз рашуча і настойліва патрабуе часосьці ад людзей, якія адзнялі ў яго колы, падшыпнікі, крывашыпы.

Паравоз—Щ—455.

3 месяцы мінула з таго часу, як яго зьнялі з руху, каб адрамантаваць, зрабіць а точку, і—зноў пусьціць машыну, спрытна адмерваць сотні кілёмэтраў, перавозіць новыя тысячы тон грузаў.

З руху зьнялі. Адзялі колы. Вывелі з адказнага строю вялізарную сілавую адзінку—паравоз. А рамонту... няма!

Навокал паравоза ходзіць, пацiскаючы пальцы, інструктар чыгуначнай МШВ, т. Мачальскі. Гараць вочы, на твары злосьць.

Каля Мачальскага—60 фабзавучнікаў. Ім даручылі рамантаваць гэтую „машыну часу і адлегласьці“.

— У чым справа?

— Для рамонту прыслалі нам з Рослаўля паравозныя колы,—пачаў Мачальскі.—Агледзелі. Крывашыпы колаў аказаліся з трэшчынамі. Адаслалі назад. Праз 15 дзён атрымалі новыя. Вымеры паказалі, што і гэтыя колы розныя па дыямэтрах бандажоў. Падганяць нельга—адаслалі. Зноў сарвалася праца. 12-га лістапада ў трэці раз атрымалі колы. І што-ж? Таксама розных дыямэтраў.

Начальнік дэпо Кавалёў настойвае на тым, каб мы падганялі гэтыя колы, забываючыся на тое, што праз дзень, два можа здарыцца крушэньне цягніка: пойдуць пад адкос сотні людзей, ці тысячы тон грузаў. Мы адмовіліся. Няхай што хоча робіць.

Ужо хутка 3 месяцы, як мы з групай фабзавучнікаў у 60 чалавек бадзяемся бяз працы. Пачыналі ня раз, але нельга рабіць шкодніцтва. Мы патрабуем другіх колаў. А пакуль што начальнік дэпо іншай працы не дае. Скажэце—што гэта за падрыхтоўка нашых маладых кадраў чыгуначнага транспорту? Што гэта за адносіны да рамонту паравозаў, якія нам так пільна патрэбны на лініі руху?

Словы Мачальскага пацьвярджаюць брыгадзіры-фабзавучнікі: Давідовіч і Жабенка.

Яны расказваюць аб тым, як настойліва дабіваліся іншай працы, каб не сядзець, альбо бадзяцца па цэхах, а па сапраўднаму адбываць сваю вытворчую практыку, набываць кваліфікацыю. Расказваюць і аб тым, што ў майстэрнях дэпо на заказы фабзавучнікаў не зьвяртаюць увагі, тэрмінова ня выконваюць іх.

— Паспрабуй занесьці што-небудзь зрабіць у кузьню, ці ў абточную майстэрню. Рэч заціснуць, махнуць рукой і скажуць: „А! Гэта для школы—пасьпеюць, сьпяшацца няма куды“. І на гэта ніхто не зьвяртае ўвагі,—скардзіцца брыгадзір-ударнік Жабенка.

Аб усім гэтым фабзавучнікі пісалі на старонках „Ч. З“.

Ставілі аб гэтым пытаньне і на бюро комсамольскай цэх'ячэйкі і колектыву, ведае аб гэтым і партколектыў. Але вынікаў няма.

Мы пытаем—хто даў права злоўжываньня з падрыхтоўкаю кадраў чыгуначнаму транспарту? Хто дазволіў ігнораваць дырэктывы партыі і ўраду.

Мы патрабуем тэрміновага ўмяшаньня органаў ЦКК НК РСІ ў справу падрыхтоўкі чыгуначных кадраў у паравозным дэпо Менск таварная.

Вінаватыя ў зрыве навучаньня фабзавучнікаў, у зрыве тэрміновага рамонту паравозу Щ—455—прыцягнуць да судовай адказнасьці.

П. Скокаў.

Энэргію і энтузіязм—на выкананьне фінпляну

У Старых Дарогах ігноруюць мобілізацыю сродкаў

Практычнымі справамі апраўдаць гонар шэфа над ашчадкасамі

„Яшчэ пасьпеем з мобілізацыяй сродкаў“

Старыя Дарогі. Раён з квартала ў квартал ня выконвае фінпляну. За нездавальняючы ход мобілізацыі сродкаў у 4-м квартале Стара-Даросві раён Наркомфінам узнагароджан рагожным сьцягам.

Абавязковыя плацяжы—падатак і страхоўка—з насельніцтва паступаюць нездавальняюча. Гадовае заданьне па спагнаньню падатку выканана толькі на 59,4 проц., у тым ліку па кулацкіх гаспадарках на 49,6 проц. Ня лепш з спагнаньнем страхоўкі. Заданьне выканана ўсяго толькі на 59,9 проц., а па кулацкіх гаспадарках на 34,9 проц. Самаабкладаньня паступіла толькі 40,1 проц. Заданьне па пазыцы „3-ці рашаючы“ на кастрычнік выканана толькі на 33,4 проц. Падпіскай ахоплены ня ўсе рабочыя, служачыя і колгасьнікі. Зусім слаба разгорнута падпіска сярод аднаасобнага сэктару.

Сабраная падпіска на пазыку не афармляецца, асабліва па колгасах. Чарговыя ўзносы не адлічваюцца і не здаюцца банку.

Заданьне па рэалізацыі акцый Трактарцэнтру выканана ўсяго толькі на 34,2 проц., абавязацельствы па машынах—2,2 проц. Райкоопсаюз ніякай працы па спагнаньню запазычанасьці не праводзіць, а першапачатковыя таварыствы вінны яшчэ 7000 р.

Рад с.-саветаў, партыйных і комсамольскіх ячэек (Горкі, Кармазы, Насекі, Жыцін і інш.) опортуністычна недаацанілі важнасьці мобілізацыі сродкаў і не мобілізавалі грамадзкасьць на гэту справу.

Старшыня Стара-дароскага с-с т. Кеніг—на запытаньне, чаму не спагнаны падатак і страхоўка з кулакоў адказаў:—„Яшчэ пасьпеем. Трэба хлебанарыхтоўкі раней выканаць, а пасьля ўжо за мобілізацыю сродкаў возьмемся“. У Шчыткаўскім с-с не спагнана з кулацкіх гаспадарак ніводнага рубля абавязковых плацяжоў. Ідуць у хвасьце спагнаньня абавязковых плацяжоў с-саветы: Насецкі (41 проц.) Кармазоўскі (42 проц.), Жыценскі (47,9 проц.)

Фінэстафэта, якая праходзіла ў раёне з 14-га кастрычніка па 7-е лістапада, належных зрухаў у выкананьні фінпляну не дала.

Комсамол Стара-Дароскага раёну абавязан па-сапраўднаму ўключыцца ў фінэстафэту, мобілізаваць грамадзкасьць на гэта і сустрэць 4-ы год пяцігодкі бяз усякай запазычанасьці ў выкананьні фінпляну.

Харытановіч, Мацько.

Толькі 68 проц.

Капыль. У Капыльскім раёне плян мобілізацыі сродкаў ня выконваецца. Заданьне 3-га квартлалу выканана ўсяго толькі на 68 проц. а ў першы месяц 4-га кварталу—на 18 проц. Абавязковыя плацяжы якія складаюць 50 проц. квартальнага пляну (500 тысяч руб.), у кастрычніку спагнаны на 18 проц. (95 тысяч руб.). Месячны плян па падатку выканан на 35 проц., па страхоўцы—45,2 проц. і самаабкладаньню—49,4 проц.

Абязьлічка, безадказнасьць, стаўка на самацёк у розных організацыях і с-с—прычына невыкананьня фінпляну 3-га кварталу і кастрычніка м-ца 4-га кварталу. Райкоопсаюз сваё заданьне выканаў на... 0 проц. Райколгассаюз акцый Трактарцэнтру рэалізаваў на 2,2 проц. Райспажыўсаюз заданьне па паёх выканаў на 21,2 проц. Ганебна плятуцца ў хвасьце некаторыя сельпо, як Пацехаўскі (0,4 проц.)

Янка Салагуб.

БАЯВОЙ ПУЦЁЎЦЫ ЦК КП(б)Б—БАЛЬШАВІЦКАЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ

Рыхтуючыся да пленуму ЦК ЛКСМБ, рэалізуем пастанову ЦК КП(б)Б аб транспорце

Пастанова аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б па дакладах дырэкцый МББ і Заходняй чыг. *)

…слухаўшы даклады дырэкцый МББ …ходняй чыгункі і судаклад ЦКК … аб рабоце дарог і правядзеньні …эктыў ЦК ВКП(б) (зварот ЦК … КП(б) ад 10-га студзеня 1931 г. …ньня чэрвеньскага пленуму ЦК … КП(б)), аб'яднаны пленум ЦК і …К КП(б)Б констатуе, што пры на…сьці некаторых нязначных палеп…ньняў у рабоце чыгунак, важней…рашэньні ЦК УсеКП(б) яшчэ ня …наны і работа чыгунак застаецца …анальняючай.

…парная язда на паравозах право…ца яшчэ ў значнай меры фармаль… адсутнічае сапраўды бальшавіцкая …цьба са зрывамі спаранай язды і …чынамі, якія іх выклікаюць, імення: …ная організацыя выкліку брыгад, …тнасьць графікаў работы паравоз… брыгад, адсутнасьць сталага пры…ваньня і здачы паравозаў па ак… а таксама частыя масавыя пера… паравозаў (па дэпо Віцебск за …гую палову кастрычніка—213 зры… ці 11,61 проц. зрываў, па Жло… ў верасьні курсавала 7 абязьлі…х паравозаў).

…іквідацыя абязьлічкі ў вагонным …ку—прымацаваньне пэўных паркаў …гункам і організацыя абменных і …онтных пунктаў праводзіцца неда…чальна слабымі тэмпамі.

…б'яднаны пленум прапануе дырэк…м чыгунак не пазьней 20 лістапа… …кончыць організацыю абменных …монтных пунктаў, забясьпечыць іх …нічным абсталяваньнем, запаснымі …камі, а таксама неабходнымі ква…каванымі кадрамі, службовымі і …ылёвымі памяшканьнямі.

…мэтах рашучага зьніжэньня про…у хворых паравозаў і вагонаў, …ум ЦК і ЦКК прапануе дырэк…м чыгунак і начальнікам раёнаў …кладна наладзіць правільнае пля…ньне ўсіх вытворчых процэсаў, …ільна расставіць рабочую сілу па …онту паравозаў і вагонаў, забясь…ць дэпо неабходнымі запасным… …камі, разгарнуўшы сапраўдную …шавіцкую працу па мобілізацыі …граных рэсурсаў. Дырэкцыя За… …іх чыгунак загрузіць завод імя …іцкага для выпрацоўкі запасных … частак, забясьпечыўшы іх … матэр'ялам.

…'яднаны пленум ЦК і ЦКК аба…е дырэкцыі чыгунак і раёны за…сьпечыць поўнае правядзеньне … т. Андрэева аб маршрутызацыі … …цыялізацыі цягнікоў, палепшыць … групы ў дырэкцыях і раёнах, … …класна ўстанавіць стандартныя … прастою і дакладныя расклады … і ўборкі вагонаў. Дырэкцыям … ўзмацніць эксплёатацыйны … апарат, рэзка павяў…

партыйную праслойку сярод работнікаў эксплёатацыі. Пленум даручае бюро дадаткова мобілізаваць партыйна-комсамольскую групу працаўнікоў для ўзмацненьня эксплёатацыйнай работы чыгункі.

Асабліва недапушчальным аб'яднаны пленум лічыць зацяжку і нерашучасьць у правядзеньні пастановы партыі аб організацыі працы і ліквідацыі „лявацкай“ ураўнілаўкі ў зарплаце.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК катэгорычна абавязвае гаспадарчыя, профсаюзныя і партыйныя організацыі на транспорце неадкладна ажыцьцявіць дырэктыву аб організацыі працы, ліквідацыі ўраўнілаўкі і правядзеньні прогрэсіўна-зьдзельнай і прэміяльнай аплаты.

Становішча працдысцыпліны ўсё яшчэ застаецца нездавальняючым. Гаспадарчыя, профсаюзныя і партыйныя організацыі не вядуць належнай барацьбы з парушэньнямі працоўнай дысцыпліны, шырокія масы рабочых не мобілізуюцца на барацьбу з кожным асобным выпадкам парушэньня яе, як з боку рабочых, так і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу. Слаба праводзіцца прэм'іраваньне лепшых ударнікаў. Недастаткова ўкаранёна сапраўдная адказнасьць выканаўцаў за даручаную працу, няма рэгулярнай і настойлівай праверкі выкананьня. Адным з разультатаў такога становішча працдысцыпліны зьяўляецца значная колькасьць здарэньняў.

Пленум ЦК і ЦКК ставіць перад партыйнымі і профсаюзнымі організацыямі на транспорце задачу рашучай барацьбы за працоўную дысцыпліну, як адну з важнейшых і асноўных задач.

Гаспадарчы разрахунак, як асноўны вагар правільнай організацыі гаспадаркі і скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў па ўсіх раёнах і асобных гаспадарчых зьвеньнях—фактычна адсутнічае. З боку раду гаспадарнікаў назіраецца простае опортуністычнае супроцьдзеяньне, ігнараваньне гаспадарчага разрахунку.

Пленум ЦК і ЦКК абавязвае дырэкцыі чыгунак, раёны, партыйныя і профсаюзныя організацыі забясьпечыць сапраўднае правядзеньне гаспадарчага разрахунку на ўсіх зьвеньнях не пазьней, як да 1-І-32 г. Прыняць рашучыя захады да эканоміі паліва.

Транспортная кооперацыя яшчэ не справілася з ускладзенай на яе задачай па бесьперабойнаму забясьпячэньню рабочых і … грамадзкага харчаваньня, масавым … харчоў … прамтаварных рэсурсаў.

Пленум папярэджвае, што справа палепшаньня працы транспорту … … задач партыйных і профсаюзных організацый на транспорце.

Адзначаючы незадавальняючае становішча жыльлёвых і бытавых умоў рабочых (асабліва на Воршы і Жлобіне) і зусім недастатковую ўвагу з боку гаспадарчых і профсаюзных організацый палепшаньню жыльлёвых і бытавых умоў, пленум ЦК і ЦКК абавязвае дырэкцыі чыгунак форсаваць заканчэньне выкананьня па 31 праграмы жыльлёвага і бытавога будаўніцтва, у раёну лістапада прывесьці ў адпаведны парадак дэпо (ацяпленьне, ашкленьне, палепшаньне санітарных умоў і г. д.).

Пленум ЦК і ЦКК прапануе гаспадарчым, партыйным і профсаюзным організацыям на транспорце зьвярнуць асаблівую ўвагу на задачы пасілення падрыхтоўкі і правільнай пастаноўкі кіруючых кадраў, асабліва ў нізавых зьвеньнях. Пашырыць сетку і контынгенты курсаў, школ і тэхнікумаў без адрыву ад вытворчасьці, забясьпечыўшы павышэньне якасьці вучэбнай работы.

Дырэкцыям чыгунак і раёнаў прыняць неадкладныя захады да поўнага комплектаваньня ФЗВ і забясьпячэньня іх (пабудова інтэрнату, вучэбнай плошчы асабліва Жлобінскай, Магілёўскай, Калінкавіцкай).

Дырэкцыям чыгунак і раёнаў неадкладна скласьці плян падрыхтоўкі кадраў на 32 год, а таксама прыступіць да складаньня пляну будучай пяцігодкі.

Пленум прапануе дырэкцыям чыгунак і раёнаў неадкладна падрыхтавацца па ўсіх лініях да барацьбы з сьнежнымі заносамі, скончыўшы ўсе падрыхтоўчыя работы і забясьпечыўшы лінію неабходнымі сродкамі барацьбы (сьнегаачышчальнікі, лапаты шчыты і др.) не пазьней 20-га лістапада.

Адзначаючы, што з боку кліентуры маюць месца яшчэ да гэтага часу безадказныя адносіны да выкарыстаньня транспорту пленум ЦК і ЦКК прапануе неадкладна рэорганізаваць і ўзмацніць апарат па пляніраваньню перавозак, палепшыць яго работы, вылучыўшы ў якасьці старшыні МСМ т. Шапіра.

Аб'яднаны пленум абавязвае ўсе профорганізацыі на транспорце ліквідаваць адставаньне ў профрабоце, рашуча змагаючыся з момантам абязьлічкі і безадказнасьці і опортуністычным благадушшам з боку раду профработнікаў і профкамітэтаў. Узмацніць нізавыя профсаюзныя зьвеньні (брыгада, зьмена, група), наладзіць сталае інструктаваньне, дыфэрэнцыяванае кіраўніцтва і жывую дапамогу нізавым профорганам з боку райпрофсаюзаў і МК ЦСПСБ забясьпечыць патрэбную дапамогу з боку ўсіх мясцовых профорганізацый профсаюзаў на транспорце.

Пленум ЦК і ЦКК прапануе партыйным організацыям галоўную ўвагу сконцэнтраваць на палепшаньні якасьці працы нізавых зьвеньняў (цэх, партгрупа, зьмена і г. д.), наладзіць оперытыўнае, дыферэнцыяванае кіраўніцтва і штодзённую дапамогу нізавым партзьвеньням і шырока ўжываць … тэхнікай камуністычных …, якія працуюць на транспорце.

Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на ўзмацненьне … нізавым транспортным дорукам. Неабходна таксама … ма-тэр'ял аб транспорце ў цэнтральных газэтах.

Абавязаць ЦК комсамолу палепшыць конкретнае кіраўніцтва і дапамогу транспортным комсамольскім організацыям.

Ад начачоў, што ў раёне, асабліва ў нізавых гаспадарчых зьвеньнях, недастаткова … выпадкаў парушэньня адзінаначальля, як з віны організацый, якія ўмешваюцца ў операцыйную работу, так і па віне самых гаспадарнікаў, якія ўхіляюцца ад адказнасьці і хаваюцца за сьпіны другіх організацый—пленум прапануе гаспадарчым, партыйным і профсаюзным організацыям зьнішчыць гэта зьявішча, цьвёрда і пасьлядоўна ажыцьцяўляць прынцып адзінаначальля на ўсіх зьвеньнях транспорту і стварыць адпаведныя абставіны і аўторытэт для гаспадарнікаў.

Аб'яднаны пленум катэгорычна патрабуе ад усіх мясцовых партарганізацый палепшаньня і дыферэнцыяванасьці кіраўніцтва пасобнымі галінамі работы транспорту, папярэджваючы, што пры … работы мясцовых партыйных органаў ЦК і ЦКК будуць … транспорту на мясцох.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б падкрэсьлівае, што ўсе задачы, стаяшчыя перад транспортам, ліквідацыі адставаньня транспорту ад росту сацыялістычнай гаспадаркі—будуць выкананы толькі ва ўмовах чуйкага ажыцьцяўленьня 6 умоў т. Сталіна, мабілізацыі шырокіх мас рабочых, партыйных організацый на барацьбу з опортунізмам, з практыкай „очковтирательства“, якія тармозяць поўнае правядзеньне дырэктыў партыі па ўзмацненьню транспорту, пры ўмовах разгортваньня сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў ва ўсёй рабоце.

Работа партыйных і комсамольскіх організацый поўнасьцю яшчэ не перабудавана і ў радзе выпадкаў адстае ад тэмпаў, якія прад'яўляюцца транспорту.

*) Друкуецца ў скарочаным выглядзе.

Комсамолія, прымай загад ЦК!

БАЛЬШАВІЦКУЮ ПРОГРАМУ—ПА-БАЛЬШАВІЦКУ РЭАЛІЗАВАЦЬ

З пастановы Бюро ЦК ЛКСМ па дакладах Віцебскага ГК і Мсьціслаўскага РК ЛКСМБ аб рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе

* Бюро ЦК прызнае зусім нездавальняючай работу Віцебскай і Мсьціслаўскай організацыі па рэалізацыі пастаноў ЦК аб пачатковай і сярэдняй школе. ЦК лічыць, што асноўны недахоп усіх комсамольскіх організацый у напрамку рэалізацыі пастаноў ЦК зьяўляецца адсутнасьць павароту да пытаньня методыкі організацыі ўнутрышкольнага жыцьця, пытаньня барацьбы за якасьць работы школ. Разам з гэтым бюро ЦК прызнае яшчэ слабую работу комсамольскіх організацый па ліквідацыі меўшыхся памылак, скажэньняў політыкі партыі ў пытаньні школьнага будаўніцтва (ліквідацыі самабіршчыны, мэтад проэктаў, „школа—цэх заводу“).

* Рашэньні ЦК УсеКПб і ЦК КПБ аб школе зьяўляюцца баявой програмай дзейнасьці комсамольскай і піонэрскай організацый. Комсамольскія і піонэрскія організацыі павінны разгарнуць рашучую барацьбу з усялякімі скажэньнямі ў школьным будаўніцтве, асноўную ўвагу ўсіх організацый накіраваць на ліквідацыю карэннага недахопу ў школе, які заключаецца ў тым, што „навучаньне ў школе не дае дастатковага аб'ёму агульна-адукацыйных ведаў і нездавальняюча вырашае задачы падрыхтоўкі для тэхнікумаў і вышэйшых школ дастаткова пісьменных людзей, добра ўладаючых асновамі навук“ (з пастановы ЦК КП(б).

* Прапанаваць Віцебскаму, Мсьціслаўскаму, усім РК і ячэйкам ЛКСМБ забясьпечыць штодзённую сыстэматычную дапамогу органам нарасьветы ў ператварэньні школы у сапраўды політэхнічную, аказваючы практычную дапамогу ў заключэньні дагавораў паміж школамі, прадпрыемствамі і колгасамі, ажыцьцяўляючы нагляд за іх выкананьнем, разгарнуўшы організацыю майстэрань і рабочых пакояў пры школах, наладзіўшы організаваную перадачу інструмантаў, варштатаў з прадпрыемстваў, нячжлівых быць скарыстанымі імі.

* Абавязаць усе РК вылучыць належныя кадры комсамольскага актыву ў дапамогу органам Нарасьветы па перапрацоўцы і пераглядзе навучальных праграм з тым, каб гэта работа была скончана ва ўстаноўлены ЦК УсеКП(б) тэрмін—не пазьней 1-І-32 г.

* Прапанаваць усім організацыям прыняць самы актыўны ўдзел у організацыі сеткі ўзорных школ, накіроўваючы туды лепшых комсамольцаў-настаўнікаў. РК узяць гэтыя школы пад асобны нагляд. Адначасова лічыць неабходным, каб гэтыя ўзорныя школы сталі комсамольскімі школамі.

* Прапанаваць Віцебскаму, Мсьціслаўскаму і ўсім РК ЛКСМБ узмацніць работу комсамольскіх ячэек і піонэрскую работу у школах, рашуча змагаючыся за ўзмацненьне дысцыпліны у школе, вядучы барацьбу з прагуламі, шырока разгарнуўшы работу па дапамозе адстаючым вучням, недапушчаючы адрыву вучняў у час заняткаў на іншыя работы, не зьвязаныя з заняткамі, разгарнуўшы ударніцтва і соцспаборніцтва у вучобе, організуючы колектыўныя формы вучобы. Організаваць дапамогу абуткам, вопраткай, вучэбнымі прыладамі, наладзіць гарачыя сьнеданьні, падвозку далёка жывучых вучняў.

* Прапанаваць „Чырвонай Зьмене“ і „Піонэр Беларусі“ узмацніць мобілізацыю ўсіх комсамольскіх і піонэрскіх організацый праз газэты на рэалізацыю пастаноў партыі аб школе.

* Абавязаць комсамольцаў-настаўнікаў і работнікаў КСМ у школе у бліжэйшы тэрмін аўладаць методыкай праз удзел у гуртках па вывучэньню методыкі, наладжваньне лекцый і г. д.

* Цяжкое становішча забесьпячэньня школ пэдкадрамі патрабуе ад комсамольскіх організацый ажыцьцяўленьня дырэктыў ЦК аб пасылцы на працу у школу ўсе пэдагогічныя сілы, якія не знаходзяцца на працы у школе. Даручыць аддзелу культуры і адукацыі разам з НК Асьветы распрацаваць мерапрыемствы па перападрыхтоўцы піонэрважатых для перадачы іх на пэдработу.

* Прапанаваць РК ЛКСМБ безадкладна выканаць дырэктывы аб мобілізацыі комсамольцаў у пэдустановы у лік „1000“.

* Прапанаваць РК праз ячэйкі ЛКСМБ і групы „лёгкай кавалерыі“ праверыць выкананьне дырэктыў ЦК і ўраду аб палепшаньні матэр'яльна-бытавога становішча настаўніцтва, прымаючы рашучыя захады да тых якія ігноруюць выкананьне гэтай пастановы.

* Аддзелу культуры і адукацыі распрацаваць мерапрыемствы па організацыі масавай праверкі выкананьня пастаноў партыі і ўраду аб школе.

Віцебская комсамолія слаба змагаецца за цэх-сталоўку

…штурм за ліквідацыю чаргі, за рознастайнае мэню, за чыстую лыжку і …рус павінна пайсьці кожная комсамольская ячэйка, кожны комсамолец

Дрэнныя абеды—удар па прамфінпляне

(Віцебск)

…алоўка—гэта цэх прадпрыем…тва. Барацьба за якасьць абедаў—…ка барацьбы за выкананьне …рфінпляну. Паглядзім-жа як зма…ецца сталовая воласа-прадзільнай …кі за добрую якасьць абедаў. …лі заходзіш у сталовую, дык …ршую чаргу кідаецца ў вочы …. На сталох, на падлозе, на лыж…х— усюды накіпеў ён тоўстым …том. Якасьць абедаў нікуды ня …, у поўным сэнсе пануе абязь….

…абедзены перапынак ля сталоў …ўжды ўбачыш доўгі хвост за …ламі на абед. Ня рэдкі выпадкі, калі рабочыя спазьняюцца на працу, усё-ж не пасьпеўшы паабедаць.

Ня лепш у сталоўках №№ 32-34 Тут абязьлічка знайшла сабе цёплы прытулак, аб зьдзельшчыне ня чуваць. Безгаспадарчасьць прыводзіць да таго, што гатовыя вырабы для буфэту прападаюць на кухні.

Так далей быць ня можа. Трэба прымусіць адміністрацыю гэтых сталовак пабудаваць сваю працу адпаведна задачам пастаўленым перад усёй грамадзкасьцю Саюзу кастрычнікаўскім пленумам УсеКП(б).

Юнкор Бурлівы.

Неадкладна перабудавацца

(Віцебск)

Абязьлічка — галоўная прычына хворасьці сталоўкі № 17.

Зараз сталоўку рэорганізавалі ў вопытна-паказальную маладзёжную.

Сталоўка ўключылася ў конкурс.

Усё гэта добра. Але слаба дапамагаюць сталоўцы партыйна-комсамольскія і прафсаюзныя організацыі, праца сталовай перабудоўваецца марудным тэмпамі.

З-за нядбайных адносін некаторых працаўнікоў зрываецца сваячасовая падача абедаў. Быў выпадак, калі комсамолец Паўлаў па нядбайнасьці затрымаў студэнтам абед на паўгадзіны.

Ні комсамольская ячэйка, ні цэх профкамітэт сталовай не прыстасавалі сваёй працы да задач, пастаўленых кастрычнікаўскім пленумам ЦК УсеКП(б).

Зараз комсамольскі колектыў ставіць пытаньне аб тым, каб сталоўка спраўдзіла сваю назву маладзёжнай. Організавана 6 брыгад, 60 проц. штату абвясьцілі сябе ўдарнікамі.

Маладзёжная сталоўка павінна стаць сапраўды паказальнай.

Хутчэй перабудаваць сваю працу, прыстасаваўшы яе да задач пасьляховага завяршэньня пляну 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

Брыгада „ЧЗ“ З. Ваўчок, Д. Усыскін.

Чаргі ня зьнішчаны

…астанова пленуму ЦК УсеКП(б) …амадзкім харчаваньні не рэалі…ецца сталоўкай заводу „Зьвязда“ (…цэвічы).

…зьмена зусім не абслугоўваецца, рабочыя маюць на абед толькі … чай. Антысанітарыя ў ста…вай ніколі ня выводзілася. На …к бруд, іржавыя лыжкі, на …зе гразь пабітыя міскі, шкляныя талеркі. Гразь праходзіць праз …ныя падлогі і сыплецца на …кты, якія хаваюцца ў кладоўцы пад падлогай.

…д сталамі гуляюць „штатныя“ …вальнікі сталовай — сабакі і сьвіньні.

Па гадзіне, а то і болей стаяць рабочыя ў чарзе за абедам. Часамі не жадаючы рабіць прагулаў, вяртаюцца яны не паабедаўшы.

Загадчык сталовай т. Коцік Ф. на непарадкі не зьвяртае ўвагі.

Для палепшаньня працы сталовак неабходна зараз-жа зрабіць наступнае:

Увесьці абонемэнтную сыстэму і сталы вучот сталоўнікаў. Разгарнуць сярод працаўнікоў сталовай соцспаборніцтва і ўдарніцтва і перайсьці на гаспадарчы разрахунак.

Стварыць над сталовай сталы кантроль усёй грамадзкасьці заводу.

Зубасты Грышка.

„Міжнародная гаварыльня“ ўзаконіла окупацыю Манчжуры

Японія ўзмацняе свае войскі ў Манчжуры

Навакол адказнай ноты японскага ўраду

Мукдэн 22. Сёньня зранку адбылася нарада прадстаўнікоў замежнага друку разам з прадстаўнікам штабу і камандуючага японскай акупацыйнай арміяй у Манчжурыі—Хондыё. Назвычайную сэнсацыю выклікала пытаньне замежных корэспондэнтаў аб тым, якім чынам тлумачыць прадстаўнік генэрала Хондыё адказ японскага ўраду на ноту Літвінава. У гэтым адказе японскі ўрад заяўляе: што „ён не дае веры розным чуткам аб дапамозе, якую Савецкі ўрад аказвае якім бы там ні было кітайскім войскам, і што ён катэгорычна заяўляе, што ня можа быць і гутарак аб тым, што японскія консульствы і вайсковыя ўлады выдумляюць чуткі і распаўсюджваюць іх праз друк і тэлеграфныя агенцтвы“.

Замежныя корэспондэнты, асабліва корэспондэнты „Нью-Ёрку Таймс“ і „Юнайтэд прэс“ адзначылі, што заява японскага ўраду ставіць іх у становішча ашуканцаў, паколькі яны паведамлялі замежныя краіны аб катэгарычных заявах генерала Хондыё адносна дапамогі, якую нібы савецкі ўрад аказвае генэралу Ма.

На нарадзе высьветлілася, што 13-га лістапада, а 6 гадз. увечары, корэспондэнт „Нью-Ёрк Таймс“ гутарыў з генэралам Хондыё, прычым Хондыё заявіў, што невядомая дзяржава „ўзмацняе апорную здольнасьць Кітаю“. Корэспондэнт сьцьвярджае, што Хондыё казаў аб тым, што ў кітайскім войску зьявілася зэнітная зброя і што з нядаўнага часу прыкмячаецца палепшаньне стральбы кітайскай артылерыі і ўжываньне новых мэтодаў стратэгіі.

Акрамя таго, заяўляе корэс, Хондыё дадаў: „з прыездам у паўночную Манчжурыю кітайскіх і корэйскіх частак „2-й Інтэрнацыянальнай арміі“ у манчжурскай абстаноўцы зьявіліся новыя элементы вялікага вайсковага і палітычнага значэньня, элементы, якія распаўсюджваюцца па ўсім Кітаі і якія ні Японія, ні іншыя краіны ня могуць ігнораваць.

Японскі генэральны консул у Харбі не Охасі паведаміў корэспондэнту, што: „назіраецца вялікі наплыў з Сібіру кітайскіх і корэйскіх комуністых савецкіх армій.“ Па зьвестках, атрыманым ад японскага консулу у Цыцыкары, 11-га лістапада для генэрала Ма з Манчжурыі прыбылі 2 танкі і 6 шасьцідзюймовых гармат.

Японскія войскі сьцягваюцца ў Манчжурыю

ТОКІЁ 22. Начальнік японскага генэральнага штабу Ханаў атрымаў санкцыю на адпраўку ў Манчжурыю частак аўтомобільнага і тэлеграфнага карпусоў.

Ліга нацый узаконьвае окупацыю Манчжуры

ПАРЫЖ 22. Даючы ацэнку дэбатам савету Лігі нацый па японакітайскаму конфлікту, т. Пэры ў „Юманітэ“ заяўляе: „Камісія Лігі нацый для вывучэньня становішча на месцы“ зьяўляецца зброяй, якую Ліга нацый пад кіраўніцтвам французскага імпэрыялізму дае ў рукі японскага ўраду для барацьбы супроць саветаў ва ўсім Кітаі“.

Масавы мітынг працоўных супроць бойкі на „Далёкім Усходзе“

ПАРЫЖ 22. „Юманітэ“ паведамляе, што парыскі камітэт французскай компартыі склікае на 1-е сьнежня масавы мітынг супроць бойкі на Далёкім Усходзе і за абарону СССР. Адбудзе рад сходаў, скліканых „вобчаствам прыхільнікаў СССР“ і прыхільнікамі барацьбе супроць ваеннай небясьпекі, абароне СССР і кітайскіх саветаў.

Аўстрыйская компартыя заклікае

ВЕНА. 22. Орган аўстрыйскай комуністычнай партыі „Ротэ Фанэ“ публікуе адозву аўстрыйскай компартыі да рабочых і сялян, у якой яна выклікае іх арганізаваць кампаніі масавага пратэсту супроць японскай правакацыі супроць японскіх і іншых імпэрыялістых і стварыць камітэт абароны Савецкага Саюзу.

АТЭНЫ. 12. Орган грэцкай компартыі паведамляе аб тым, што забаронена выданьне часопісу „Прыхільнікі СССР“—орган грэцкай арганізацыі „вобчаства прыхільнікаў СССР“.

Польскія імпэрыялістыя узмоцнена рыхтуюцца

ВАРШАВА. 22. Услед за ўвядзеньнем закону аб мілітарызацыі чыгунак, польскі ўрад падрыхтоўвае законапроэкт аб мілітарызацыі пошты і тэлеграфу.

У акупаваным горадзе

ТОКІЁ. Агенцтва „Сымбун-рэнго“ паведамляе з Мукдэну: „Усе японскія войскі, якія былі раней сконцэнтраваны ў раёне ракі Нові, скончылі ўступленьне ў Цыцыкар.

Рэалізаваць пастанову ЦК КП(б)Б і СНК аб соцыялістычнай перабудове сталіцы—Менску

У першай палове кастрычніка г. г. пастановай ЦК КП(б)Б і СНК вызначаны шляхі соцыялістычнай перабудовы сталіцы БССР—Менску. Адзін з галоўнейшых момантаў, высунутых пастановай ЦК,—палепшаньне быту рабочага. Гэта мае вялізарнае значэньне для разгортваньня соцыялістычнага будаўніцтва.

Прайшоў значны час, як апублікавана пастанова аб рэконструкцыі Менску, а рашучага пералому ўсё яшчэ няма.

Праўда, у галіне плянаваньня Менскі Камгас зрабіў некаторыя крокі. Запроэктаваны 4 каменныя будынкі і некалькі драўляных на 862 кватэры, але дзе будаваць іх, у якіх раёнах,—вакол гэтага не мобілізавана грамадзкасьць. Па пляну, вызначана зрабіць надбудоўкі на 929 каменных дамох, але гэтыя наметкі не ажыцьцяўляюцца.

Менскі аддзел комунальнай гаспадаркі распачаў пракладку трамвайнай лініі па Барысаўскім тракце. Зараз падвозяцца рэйкі. Аднак, Камгас не разгортвае работы па мобілізацыі рабочай сілы, дык будаўніцтва зрываецца.

Акрамя гэтага, плянам прадугледжана трамвайная лінія на Ляхаўку. Пакуль што прыступілі да падрыхтоўкі рэек. Пракладка лініі на Ляхаўку затрымліваецца тым, што пабудова маста вядзецца нездавальняючымі тэмпамі, бо Дзяржплян чамусьці ня ўключыў маста ў плян забясьпечаньня матар'яламі.

Зусім бясплянава ня гледзячы на папярэджаньні Камгасу разгортваюць будаўніцтва „Чырвоны Кравец“, фабрыка „Комунарка“ і кіраўніцтва бойні. Гэтыя організацыі будуюць драўляныя будынкі ў тых раёнах, дзе трэба будаваць каменныя.

Менскі Леспрамгас і Лесазбыт яшчэ не зрабілі належнага павароту ў забясьпечаньні матар'яламі і рабочых плянавага будаўніцтва, якое разгортвае Менскі аддзел камунальнай гаспадаркі, Менбуд і іншыя організацыі.

У галіне жыльлёвай гаспадаркі таксама ня зроблена рашучых паваротаў.

У галіне абзеляненьня рабочых пасёлкаў, кварталаў, заводаў, фабрык і нават цэхаў—перад ЖАКТамі, заводакіраўніцтвамі, партыйнымі і комсамольскімі організацыямі стаяць вялізарныя задачы, ажыцьцявіць якія неабходна як найхутчэй.

Зараз па Менску праведзена брукаваньне часткі вуліц. Укладка клінкеру, асфальтаваньне тратуараў і інш. работы. Аднак, з усёй рашучасьцю неабходна адзначыць, што ў разгортваньні гэтага будаўніцтва няма належнага кантролю. У пааасобных мясцох вуліц Карла-Маркса, Савецкай і Ленінскай работы вытвораны зусім нядбайна. Гэта вынік нядбайных, а часам і шкодніцкіх адносін да рамонту вуліц сталіцы.

Мы патрабуем прыцягнуць да адказнасьці конкрэтных вінавайцаў.

Трэба памятаць, што пастанова ЦК КП(б)Б і СНК абавязваюць рад організацый, і ў першую чаргу Камгас, у бліжэйшы тэрмін перавярыць Менск ва ўзорны горад.

П. П—скі.

Раўняцца па перадавых

Комсамольская ячэйка колгасу „Комсамолец“ Любаньскага раёну добра змагаецца за організацыю работы сьвінагадоўчае таварнае фэрмы. Адрамантаваны і прыстасаваны да зімоўкі сьвінарнікі. Зроблены асобныя станкі для кожнай сьвіньні.

Комсамольская ячэйка ўзяла шэфства над догляданм сьвіней. Мобілізаваны і пасланы на сьвінарнік прыкладныя комсамольцы.

А. Весабей.

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСА[...]

27-га лістапада а 6-й гадз. увеч., у актавай залі Хэміка-Тэхналёгічнага Інстытуту склікаецца пашыраны сход комсамольскага актыву навучальных установ.

Парадак дня:

1. Вынікі 3-га Усебеларускага зьезду навуковых працаўнікоў (дакл. Шапіра);
2. Чарговыя задачы комсамольскай організацыі навуковых устаноў у справе ўключэньня іх у сталінскі паход (дакл. т. Фрумкіна).

На актыў павінны зьявіцца комсамольцы асьпіранты Акадэміі Навук, НДІ, Ін-ту прамысловасьці і рэконструкцыі с-г., чл. бюро к-ячэек. ВТНУ, ВНУ і тэхнікумаў, комсамольцы—чл. профкомаў.

Білеты атрымаць у Менгаркоме ЛКСМБ.

Менгарком ЛКСМБ

Комсамол—шэф усеабучу

Кінуць комсамольскія батальёны НА ФРОНТ УСЕАБУЧУ

Палацак разгортвае работу

Полацкая комсамолія выклікала на соцспаборніцтва па ажыцьцяўленьню шэфскіх абавязкаў над ўсеабучам Аршанскую комсамолію і арбітрам абрала „Чырвоную Зьмену“. Тав. Я. Л—ч паведамляе пра першыя вынікі ажыцьцяўленьня Полацкім РК узятых абавязкаў:

„Полацкая комсамолія шырока разгарнула масавую работу па давядзеньню рашэньняў партыі аб школе да кожнага рабочага і колгасьніка. На гэтую справу мобілізаваны ўвесь раённы актыў. Прадпрыемствы і колгасы бяруць на сябе конкрэтныя абавязкі перад школай. З ліку 4-х узорных школ РК ЛКСМБ організаваны 2 узорных комсамольскія школы ў раёне.

Задача гэтых школ дабіцца сапраўдных бальшавіцкіх паказчыкаў школьнай і піонэрскай работы і перанесьці свой вопыт ва ўсе астатнія школы раёну.

Праведзеная 15-га лістапада кантрольная раённая нарада комсамольцаў-настаўнікаў і сакратароў ячэек выявіла, што паасобныя школы, як Бабыніцкая ШКМ, Арэхаўская школа не ўразумелі сутнасьці пастановы партыі аб школе аб неабходнасьці павышэньня якасьці школьнай работы. Праца ў гэтых школах вядзецца бяз пляну, настаўнікі не падвышаюць сваю падрыхтоўку. Нарада вынесла пастанову організаваць пры школах, дзе маюцца комсамольцы-настаўнікі, ударныя брыгады ім. пастановы ЦК аб школе і выклікаць на соцспаборніцтва астатнія педколектывы раёну па рэалізацыі пастановы ЦК.

Пры Ветрынскай, Быкаўскай, Бабыніцкай і Трудаўскай сямігодках організавана 4 брыгады з настаўнікаў-комсамольцаў і беспартыйнага настаўніцтва па перагляду падручнікаў першага концэнтру. Кожны педколектыў гэтых школ узяў на сябе абавязак пераглядзець асноўны падручнік для адной групы ў напрамку ізоляцыі з яго клясава-шкоднага матар'ялу, а таксама ўнясеньня дадаткаў па пытаннях бягучага жыцьця і выпраўленьня мэтодычных недахопаў падручніка. Улічваючы незабясьпечанасьць школ апалам, РК ЛКСМБ організаваны раённы комсамольскі суботнік па загатоўцы і вывазцы дроў для школ. Гарсавет, Райвыканком і Райколгассаюз падтрымалі ініцыятыву комсамолу і ператварылі суботнік у агульна-раённы. Прадпрыемствамі гораду мобілізавана 302 падводы і 3 грузавых машын для вывазкі дроў гарадзкім школам. Ход першых дзён суботніку паказаў, што гарадзкія школы будуць забясьпечаны апалам.

Аршанская комсамолія да гэтага часу не адказала на наш выклік“.

Першыя крокі Полацкай комсамоліі паказваць, якіх бліскучых вынікаў магчыма дабіцца пры бальшавіцкіх тэмпах работы.

Аршанскі РК ЛКСМБ павінен неадкладна адказаць на выклік Полацкага. Гэтага чакае і Полацкая комсамолія і „Чырвоная Зьмена“.

7 рэйд віцебскіх юнкораў

Якасьць—у парадак дня

Праведзены юнкораўскай брыгадай „Чырвонай Зьмены“ рэйд яскрава паказаў, што комсамольская організацыя Віцебшчыны нездавальняюча ажыцьцяўляе шэфства над усеабучам. Не разгорнута барацьба за якасьць політэхнізацыі.

Майстэрня 4-й сямігодкі зусім не прыстасавана да работы. У майстэрні ёсьць некалькі цісоў і сталярных варштатаў ды і тэ папсаваныя. Яшчэ ў мінулым годзе школа заключыла ўмову з панчошнай фабрыкай, да якой школа прымацавана для політэхнізацыі. Паводле гэтай умовы фабрыка павінна была абсталяваць школьную майстэрню. Абавязак не выкананы. Комсамольскі колектыў, ведаючы пра такое становішча ў школе, ніякіх захадаў ня ўжывае.

Адміністрацыя заводу „Камінтэрн“ не жадае аплачваць інструктароў, якія працуюць з вучнямі па політэхнізацыі. Політэхнізацыя школы з-за гэтых прычын зрываецца. Школа не аднакроць зьвярталася за дапамогай да ячэйкі, але ячэйка заводу не зварачае ўвагі на стан работы школы.

У 5-й беларускай школе яшчэ і ня думалі ажыцьцяўляць політэхнізацыю.

Гэткіх фактаў надзвычай багата.

У рэйдзе прымалі удзел **З. Ваўчок. Д. Усыскін, У. Шмідт В. Азёрны.**

УСІМ УДАРНІКАМ-ЧЫРВОНАЗЬМЕНАЎЦАМ!

З 27-га па 30-га лістапада

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“

праводзіць **УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД**

ПА ПЫТАНЬНЮ:

як перабудоўваюць сваю працу комсамольскія магазыны, згодна пастаноў Кастрычнікаўскага Пленуму ЦК УсеКП(б).

ЮНКОРЫЯ! Да ўдзелу ў рэйдзе прыцягвай усю комсамольскую і беспартыйную моладзь

Рэдакцыя газ. „ЧЗ“

26-га лістапада, а 20 гадзіне 15 хвілін,

ЦК ЛКСМБ і радыё-газэта „Комсамолец Беларусі“

ПРАВОДЗЯЦЬ

УСЕБЕЛАРУСКУЮ РАДЫЁ-ПЕРАКЛІЧКУ

КОМСАМОЛЬСКІХ ОРГАНІЗАЦЫЙ

па пытаньнях барацьбы комсамолу за ажыцьцяўленьне цэнтральнай задачы—організацыйна-гаспадарчага замацаваньня колгасаў.

У мікрофона: Полацак, Віцебск, Ворша, Слуцак, Магілеў, Гомель, Быхаў і Бабруйск.

Рапартуюць прадстаўнікі РК ЛКСМБ, сэкратары паасобных колгасных ячэек і ўдарнікі-колгасьнікі.

Перад пачаткам пераклічкі выступяць прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ і Белколгасцэнтру.

Організуйце колектыўнае слуханьне, праверце падрыхтаванасьць радыё-прыёмнікаў, рыхтуйцеся да радыё-пераклічкі!

ЦК ЛКСМБ, рэдакцыя радыё-газэты „Комсамолец Беларусі“

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.